# «ДЛЯ АДБІЦЦЯ ВЕРАГОДНЫХ ПАСКУДСТВАЎ У ДАЧЫНЕННІ ДА БЕЛАРУСІ Ў НАС ЁСЦЬ УСЁ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Кіраўнік дзяржавы растлумачыў: гэта нарада не для таго, каб паглыбіцца ў размову аб праблемах арміі. Па яго словах, тэма будзе абмяркоўвацца пазней. «А вось гэта канкрэтнае пытанне, звязанае з беларуска-ўкраінскай граніцай: мінуў пэўны час, і наколькі сур'ёзна тое, што адбываецца там з боку Украіны?» — удакладніў беларускі лідар.

Міністр абароны Віктар Хрэнін далажыў, што абстаноўка на паўднёвым аперацыйным напрамку застаецца напружанай: «Фарміраванні ўзброеных сіл пагранічнай службы Украіны працягваюць удасканальваць сістэмы аховы граніцы і элементаў эшаланаванай абароны. На ўсіх участках уздоўж дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь адзначаецца актыўная дзейнасць сіл спецыяльных аперацый і службаў бяспекі Украіны. Бесперапынна вядзецца разведка, для чаго выкарыстоўваюцца беспілотныя лятальныя апараты, у тым ліку са спробамі парушэння нашай паветранай прасторы. Ва ўмовах прысутнасці ўкраінскіх узброеных фарміраванняў у прыгранічных раёнах захоўваецца высокая верагоднасць падрыхтоўкі і правядзення на нашай тэрыторыі ўзброеных правакацый, а таксама рэзанансных акцый, у тым ліку з задзейнічаннем беларускіх нацыяналістычных фарміраванняў».



Фота БелТА.

## У тэму

### УЗБРОЕНЫЯ СІЛЫ ГАТОВЫ АДЭКВАТНА РЭАГАВАЦЬ НА ПРАВАКАЦЫІ І ВЫКЛІКІ

**Начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл Павел МУРАВЕЙКА** расказаў журналістам, што на нарадзе былі абмеркаваны ўмовы, фактары, пагрозы, якія канцэнтруюцца на паўднёвым аперацыйным напрамку ўздоўж паўднёвай граніцы. «Абстаноўка, скажу шчыра, няпростая. Канцэнтрацыя войскаў, мерапрыемствы, якія праводзіцца ўкраінскім бокам у нашым прыгранiччы, дзеянні, якія сёння выклікалі рэзананс сусветнага маштабу на курскім напрамку, прымушаюць нас задумацца, ці можам мы супрацьдзейнічаць падобным выклікам і пагрозам», — сказаў ён. Па словах Паўла Муравейкі, Прэзідэнт канкрэтна спытаў кіраўніцтва ваеннага ведамства, да чаго мы гатовы і як будзем процідзейнічаць. «Узброеныя Сілы гатовы выконваць задачы і адэкватна рэагаваць на любыя правакацыі і выклікі супраць нашых граніц і нашай дзяржавы», — запэўніў начальнік генштаба.

Журналісты згадалі, што месяц таму беларускі бок ужо ўмацоўваў беларуска-ўкраінскую граніцу. Пасля зняцця напружання сітуацыя нармалізавалася. Прадстаўнікі СМІ пацікавіліся, ці супастаўнае цяперашняе ўмацаванне граніцы з тым, што было ў пачатку ліпеня. «Тая маштабная рэзанансная правакацыя, якая праведзена ўкраінскімі ўзброенымі сіламі на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі, у прыватнасці ў Курскай вобласці, прымусіла нас перагледзець склад сіл і сродкаў, якія мы прыцягваем для забеспячэння нашай бяспекі. Мы нарасцілі групоўку супрацьпаветранай абароны, таму што фактары залёту ў нашу паветраную прастору беспілотных лятальных апаратаў пачасціліся. Мы стварылі неабходныя ўмовы для разгортвання груповак цяжкай тэхнікі. Мы адэкватна гатовы адрэагаваць на правакацыі, падобныя тым, што адбыліся ў Курску. Мы кантралюем нашу дзяржаўную граніцу, нарасцілі сілы і сродкі разведкі. Вядзём стварэнне пэўных запасаў і магчымасцяў для стварэння і разгортвання груповак. Аб'ектыўна магу адзначыць, што сёння той склад сіл і сродкаў, які выведзены на граніцу, большы, чым той, які быў створаны раней. Ён забяспечвае адэкватнае супрацьдзеянне любым выпадам і любым правакацыям», — адказаў Павел Муравейка.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# ПРА НОВАЕ СКЛІКАННЕ І СПРАВЫ Ў СТАЛІЦЫ

## Прэзідэнт прыняў з дакладам Наталлю Качанаву



Фота БелТА.

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам Старшыню Савета Рэспублікі Наталлю Качанаву. Яна таксама з'яўляецца ўпаўнаважаным Прэзідэнта па Мінску. Таму кіраўнік дзяржавы пачаў размову з пытанняў, якія датычыцца сталіцы. Асабліва яго цікавіла эканамічная сітуацыя ў горадзе, работа прадпрыемстваў, у прыватнасці Мотавелазавода. Прэзідэнт таксама цікавіўся работай новага склікання Савета Рэспублікі і міжнароднай дзейнасцю парламентарыяў.**

Наталля Качанава далажыла, што Савет Рэспублікі новага склікання правёў ужо чатыры пасяджэнні, прыняты 31 законапраект. «Уключыліся ўсе ў работу даволі актыўна, працуем з людзьмі, разглядаем тыя законапраекты, якія прадстаўлены нам на экспертным савеце. Работа вядзецца актыўна па ўсіх кірунках», — адзначыла яна.

Размаўляючы з журналістамі пасля даклада ў Прэзідэнта, Наталля Качанава заўважыла, што склад Савета Рэспублікі абнавіўся, але характар работы не змяніўся: у цэнтры ўвагі сенатараў — дзейнасць над законапраектамі, работа з людзьмі, міжнародная дзейнасць. Не спыняецца работа членаў Савета Рэспублікі з насельніцтвам, праводзяцца асабістыя прыёмы грамадзян, прамыя тэлефонныя лініі, сустрэчы ў працоўных калектывах. «За чатыры месяцы мы правялі больш за 470 сустрэч у працоўных калектывах, да нас паступіла больш за дзве тысячы зваротаў, прайшло 108 тэлефонных ліній. Штомесяц усе члены Савета Рэспублікі праводзяць прыёмы па асабістых пытаннях», — прывяла лічбы спікер. Паводле яе слоў, работа з насельніцтвам важная і для работы над законапраектамі: «Як гаворыць наш Прэзідэнт: «законы павінны быць ад зямлі». Роўна так мы імкнёмся працаваць над законапраектамі».

Наталля Качанава таксама звярнула ўвагу, што з сямі членаў Савета Рэспублікі, якія працуюць на прафесійнай аснове, ёсць упаўнаважаныя Прэзідэнта па Брэсцкай, Магілёўскай абласцях і Мінску. «Я як упаўнаважаны па Мінску далажыла Прэзідэнту аб выкананні яго даручэнняў. Перш за ўсё гэта датычылася тых прадпрыемстваў, якія наведваў Прэзідэнт і дзе ім былі пастаўлены адпаведныя задачы. Гэта Мотавелазавод, МАЗ, «Гарызонт». Мы сёння вядзём кантроль за дзейнасцю гэтых прадпрыемстваў, за рэалізацыяй праектаў. Хачу сказаць, усё ідзе па графіку, нават з апярэджаннем графіка. Мы спадзёмся, што ў найбліжэйшы час, у 2025 годзе, «Мотавела», як і было абяцана, запрацуе на поўную магутнасць. І не толькі само прадпрыемства, але і тыя рэзідэнты, якія ўключаны ў тэхнапарк», — распавяла Наталля Качанава. Што датычыцца выканання прагнозаў сацыяльна-эканамічнага развіцця, то, паводле яе слоў, горад Мінск выканаў усе даведзеныя заданні, па некаторых пазіцыях нават з апярэджаннем. «Але разам з тым самазаспакойвацца нельга. Мы разумеем, што трэба працаваць, прырастаць. І ў сталіцы мы павінны паказваць дастойныя вынікі. Таму што сегмент Мінска ў эканоміцы краіны значны», — адзначыла Наталля Качанава.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Кітаі заявілі, што не збіраюцца ўдзельнічаць у ядзернай гонцы ўзбраенняў з ЗША



Кітайскія ўлады не будуць нарошчваць баявы ядзерны патэнцыял для ўдзелу ў гонцы ўзбраенняў з ЗША ці іншымі краінамі. Аб гэтым заявіў афіцыйны прадстаўнік МЗС КНР Лінь Цзянь, паведаміла ТАСС. «Ядзерны арсенал Кітая зусім не стаіць на адным узроўні са Злучанымі Штатамі, — адзначаецца ў каментарыі, апублікаваным на сайце кітайскага знешнепалітычнага ведамства. — КНР заўсёды падтрымлівае свае ядзерныя сілы на мінімальным узроўні, неабходным для забеспячэння нацыянальнай бяспекі. Мы ні з кім не ўдзельнічаем у гонцы ўзбраенняў». Лінь Цзянь нагадаў, што Пекін праводзіць палітыку непрымянення ядзернай зброі першым і прытрымліваецца стратэгіі самаабароны. Ён таксама адмовіўся каментаваць перадвыбарную рыторыку ў ЗША. Як вядома, раней кандыдат у прэзідэнты ЗША ад Рэспубліканскай партыі Дональд Трамп у інтэрв'ю ўладальніку X Ілану Маску дапусціў, што КНР перасягне Злучаныя Штаты па памеры ядзернага арсенала ў выніку яго нарошчвання.

### Германія застаецца найбуйнейшым донарам ЕС

ФРГ у мінулым годзе стала найбуйнейшым чыстым донарам у Еўрасаюзе, значна апярэдзіўшы Францыю. Германія заплаціла ў бюджэт ЕС на 17,4 мільярда еўра больш, чым атрымала ад яго. Пра гэта паведаміла ТАСС, зыходзячы з ацэнкі Інстытута германскай эканомікі (IW).



У 2022 годзе гэты паказчык склаў 19,7 млрд еўра. На думку IW, прычынай зніжэння стала слабая эканамічная сітуацыя, якая, верагодна, паўплывае і сёлета. Чыстыя выплаты могуць крыху зрушыцца ў бок Іспаніі і Партугаліі, дзе справы ў эканоміцы ідуць лепш, чым у Германіі. Летась Парыж выплаціў амаль на 9 млрд еўра больш, чым атрымаў. Італія знаходзіцца на трэцім месцы з чыстым укладам каля 4,5 млрд еўра. Найбуйнейшым чыстым атрымальнікам летась, як і ў папярэднім годзе, стала Польшча з 8,2 млрд еўра. За ёй ідуць Румынія (6 млрд еўра) і Венгрыя (4,6 млрд еўра). Бюджэт Еўрасаюза ў мінулым годзе склаў 173,1 млрд еўра.

### У Афрыцы аб'явілі надзвычайную сітуацыю з-за эпідэміі воспы малпаў



Кіраўнік Сусветнай арганізацыі аховы здароўя Тэдрас Адханам Гебрэесус аб'явіў эпідэмію воспы малпаў надзвычайнай сітуацыяй у галіне грамадскай аховы здароўя, якая мае міжнароднае значэнне. Аб гэтым паведаміла РІА «Новости». Камітэт па надзвычайных сітуацыях СААЗ сабраўся ў сувязі з сітуацыяй з гэтым захворваннем у Афрыцы. Напярэдадні Афрыканскія цэнтры па кантролі і прафілактыцы захворванняў (CDC) аб'явілі надзвычайную сітуацыю ў галіне аховы здароўя з-за ўспышкі воспы малпаў. Кіраўнік СААЗ паведаміў, што ў мінулым годзе колькасць зарэгістраваных выпадкаў воспы малпаў значна ўзрасла, а сёлета яна перавысіла леташні паказчык — іх ужо зарэгістравалі больш як 14 тысяч і 524 смяротныя. «Выяўленне і хуткае распаўсюджванне новай разнавіднасці воспы малпаў ва ўсходняй частцы Дэмакратычнай Рэспублікі Конга, яе выяўленне ў суседніх краінах, якія раней не паведамлялі аб выпадках воспы малпаў, і патэнцыяльная магчымасць далейшага распаўсюджвання ў Афрыцы і за яе межамі выклікаюць вялікую трывогу», — заўважыў Гебрэесус.